**ДЫЯ́РЫУШ** (ад лац. diarium дзённік), гістарычна-дакументальная проза, у якой адлюстраванне фактаў, здарэнні паліт., грамадскага, прыватнага характару пададзены ў храналагічнай паслядоўнасці ў форме датаваных запісаў; жанр эпічнага роду л-ры. Для Д. таксама характэрны аўтарскі суб'ектывізм у ацэнках тых або інш. гіст. падзей ці асоб. Д. на тэр. Беларусі пачалі стварацца ў 16 ст. («Дыярыуш Люблінскага сойма»). Адзін з першых аўтабіягр. Д. належыць Ф.Еўлашоўскаму (датаваныя запісы: з 1564 па 1604). У 16—17 ст. аўтарамі Д. былі С.Маскевіч, А.Філіповіч, А.С.Радзівіл, А.Каменскі-Длужык і інш. Напісаныя па гарачых гіст. слядах, гэтыя творы вылучаліся ўвагай да запатрабаванняў чалавека, яго побыту, паліт. і рэліг. перакананняў. У 17—18 ст. Д. называліся творы рознага зместу: мемуары, хранографы, сямейныя дзённікі, аўтабіягр. запісы, журналы падарожжаў, ваен. паходаў. У 2-й пал. 18 ст. на змену Д. прыйшлі ўспаміны (М.Матушэвіч, Ф.Карпінскі і інш.), якія ў 19 ст. сталі адным з найб. прадуктыўных жанраў польскамоўнай л-ры Беларусі (Г.Жавускі, І.Ходзька, Ю.Крашэўскі і інш).

*В.І.Еўмянькоў.*

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова